БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

УДК 821.161.3.09-311.6(043.3)

**БАГАРАДАВА**
Таццяна Робертаўна

# ЭВАЛЮЦЫЯ ЎВАСАБЛЕННЯ ВАЕННАЙ ТЭМЫ ПІСЬМЕННІКАМІ-ВЕТЭРАНАМІ І СВЕДКАМІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ АПОВЕСЦІ (1980 – 1990-я гг.)

Аўтарэферат дысертацыі
на суісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2021

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

**Навуковы кіраўнік** **Сінькова Людміла Дзмітрыеўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

**Афіцыйныя апаненты:** **Штэйнер Іван Фёдаравіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай літаратуры УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны»

**Мішчанчук Ірына Мікалаеўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка»

**Апаніруючая арганізацыя** УА «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава»

Абарона адбудзецца 19 сакавіка 2021 г. у 13.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце (220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. вучонага сакратара: 378-63-78).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «    » лютага 2021 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый М.М. Хмяльніцкі

# УВОДЗІНЫ

Для Беларусі і беларусаў Вялікая Айчынная вайна стала адным з важнейшых чыннікаў гартавання нацыі. У вайне з гітлераўскай Германіяй беларускі народ панёс найвялікшыя страты. Разам з тым у 1945 г. БССР увайшла ў склад міжнароднай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН) як годны, асобны, заўважаны і паважаны суб'ект гісторыі.

Вывучэнне эвалюцыі ваеннай тэмы, зафіксаванай у аповесцях 1980 – 2000-х гг. аўтарства беларускіх пісьменікаў-ветэранаў, відавочцаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, з'яўляецца важнай прычынай для сучасніка звярнуцца да маральна-этычных каштоўнасцей, бо беларуская нацыя падчас новага этапу самарэалізацыі мае вострую патрэбу ў пераасэнсаванні гісторыі ХХ ст.

У сучасным літаратуразнаўстве існуе вялікая колькасць навуковых прац, прысвечаных ваеннай прозе розных жанраў. Жанр беларускай ваеннай аповесці, асабліва 1960-х і пазнейшых гадоў, сістэматычна даследаваўся А. Адамовічам, Л. Алейнік, С. Андраюком, В. Бароўкай, А. Бельскім, Д. Бугаёвым, П. Васючэнкам, З. Гімпелевіч, У. Гніламёдавым, Э. Гурэвіч, П. Дзюбайлам, Г. Друк, В. Жыбулем, В. Каваленкам, Я. Клімуцем, В. Локун, Е. Лявонавай, А. Макарэвічам, М. Мішчанчуком, М. Мушынскім, У. Навумовічам, Л. Сіньковай, Т. Тарасавай, Г. Тычко, М. Тычынам, І. Шаблоўскай, І. Шаладонавым, Т. Шамякінай, С. Шапранам, Г. Шупенькам, многімі іншымі літаратуразнаўцамі і крытыкамі. У працах манаграфічнага і кампаратыўнага характару замежных, найперш рускіх, вучоных (М. Анастасьеў, Л. Анінскі, С. Бачароў, І. Дзядкоў, П. Топер) айчынная аповесць (асабліва А. Адамовіча, В. Быкава, І. Навуменкі, І. Шамякіна) таксама прыцягвала вялікую ўвагу. Рэзананснае прысуджэнне ў 1986 г. Ленінскай прэміі В. Быкаву за аповесць «Знак бяды» (1982) стала той этапнай падзеяй для літаратуры СССР, пасля якой многія ветэраны Вялікай Айчыннай вайны звярнуліся да перажытага ў 1940-я гг. з новым адчуваннем унутранай свабоды, з патрэбай раскрыць самыя глыбокія пласты сваёй памяці.

**Актуальнасць** працы вызначана:

– каштоўнасцю мінулага трагічнага народнага вопыту, які пачаў пераасэнсоўвацца ў беларускай аповесці пра вайну пасля распаду СССР;

– неабходнасцю спецыяльнага сістэмнага вывучэння тых мастацкіх тэкстаў у жанры аповесці, што былі напісаны ветэранамі, відавочцамі і ахвярамі Вялікай Айчыннай вайны ў 1980 – 1990-я і пазнейшыя гады;

– патрэбай у абноўленай характарыстыцы эвалюцыі выяўленчых і фармальных магчымасцей жанру аповесці пра вайну, а таксама поглядаў празаікаў-ветэранаў на перажытае.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь працы з навуковымі праграмамі (праектамі) і тэмамі**

Даследаванне праведзена ў межах наступных навуковых тэм кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт»: «Беларуская мова і літаратура ў кантэксце славянскіх, германскіх і раманскіх моў і літаратур: гісторыя і сучаснасць» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі: 1926, тэрмін выканання 2006 – 2010 гг.), «Славянскія, германскія і раманскія мовы і літаратуры: агульнае і адметнае ў гістарычным і сучасным узаемадзеянні нацыянальных культур» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі: 2311, тэрмін выканання 2011 – 2015 гг.), «Вобразы “свой” – “чужы” ў нацыянальнай карціне свету ў беларускай, рускай і замежнай літаратурах і мовах» (№ дзяржаўнай рэгістрацыі: 20160283, тэрмін выканання 2016 – 2020 гг.).

**Мэта і задачы даследавання**

**Мэта** дысертацыйнага даследавання – вызначыць сутнасць і спецыфіку эвалюцыі ў асэнсаванні ваеннай тэмы беларускімі пісьменнікамі-ветэранамі або відавочцамі Вялікай Айчыннай вайны на прыкладзе жанру аповесці, створанай у перыяд 1980 – 1990-х гг., у аспекце кантэкстуальнага аналізу.

Дасягненне пастаўленай мэты прадугледжвае вырашэнне наступных **задач**:

1) выявіць вытокі і шляхі развіцця ваеннай тэмы ў беларускай прозе ХХ ст.;

2) вылучыць і ахарактарызаваць асноўныя мастацкія формы раскрыцця ваеннай тэмы ў аповесцях беларускіх пісьменнікаў-ветэранаў або відавочцаў Вялікай Айчыннай вайны з улікам гісторыка-культурнага кантэксту;

3) устанавіць напрамкі ў познесавецкім абнаўленні трактовак тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў жанры беларускай аповесці перыяду 1980 – 1990-х гг.;

4) вызначыць эвалюцыю жанравай формы ў беларускай аповесці пра вайну перыяду 1980 – 1990-х гг.;

5) раскрыць і ахарактарызаваць сацыяльнае значэнне і эстэтычны патэнцыял беларускай аповесці пра Вялікую Айчынную вайну як літаратурнага і культурнага феномена ў ХХ – пач. ХХІ стст.

**Аб’ект і прадмет даследавання**

**Аб’ектам** даследавання з’яўляюцца мастацкія тэксты ХХ ст. у жанры аповесці на тэму вайны ў творчасці пісьменнікаў-франтавікоў: М. Аўрамчыка, В. Быкава, А. Карпюка, А. Кулакоўскага, І. Навуменкі, І. Новікава, А. Савіцкага, І. Шамякіна, а таксама пісьменнікаў з вопытам антыфашысцкага супраціву або ваеннай траўмы з часоў Вялікай Айчыннай вайны як часткі Другой сусветнай: А. Адамовіча, А. Асіпенкі, Н. Гілевіча, У. Дамашэвіча, В. Казько, У. Ліпскага, Б. Сачанкі перыяду 1980 – 1990-х гг., з улікам кантэксту папярэдняй беларускай прозы ХХ ст. пра вайну ў жанры аповесці.

**Прадмет** даследавання – формы і тэндэнцыі рэпрэзентацыі ваеннай тэмы ў жанры аповесці ў творчасці пісьменнікаў-ветэранаў або відавочцаў Вялікай Айчыннай вайны.

**Навуковая навізна даследавання**

У дадзеным даследаванні **ўпершыню** ў беларускім літаратуразнаўстве:

– на падставе комплекснага вывучэння беларускіх аповесцей ХХ ст. з ваеннай тэматыкай вылучаны і канцэптуальна-цэласна ахарактарызаваны корпус тых прадстаўнічых тэкстаў, што былі створаны ў 1980 – 1990-х гг. беларускімі пісьменнікамі-ветэранамі і відавочцамі Вялікай Айчыннай вайны з дзвюх генерацый: а) народжаных у 1910-я гг.; б) народжаных у 1920 – 1940-я гг.;

– выяўлена эвалюцыя ідэйна-эстэтычных канцэпцый (павышэнне ўвагі да асэнсавання трагічных бакоў жыцця, экзістэнцыйнага светаразумення, перагляду ролі рэлігіі ў жыцці постсавецкага чалавека) у творах пра вайну канца ХХ ст. А. Адамовіча, А. Асіпенкі, В. Быкава, Н. Гілевіча, В. Казько, І. Навуменкі, Б. Сачанкі, І. Шамякіна;

– вызначана эвалюцыя жанравай формы аповесці (развіццё аўтабіяграфічнага наратыву і псіхалагізму, паэтыкі магічнага рэалізму, антыўтопіі, зварот да дакумента з выкарыстаннем журналісцкіх стратэгій, узнікненне «прозы галасоў») у творах пра вайну канца ХХ ст. А. Адамовіча, В. Быкава, Н. Гілевіча, В. Казько, Б. Сачанкі;

– вылучана і ахарактарызавана істотнае пашырэнне праблемна-тэматычнага дыяпазону ў аповесцях М. Аўрамчыка, У. Дамашэвіча, А. Карпюка, А. Кулакоўскага, У. Ліпскага, І. Новікава, А. Савіцкага, напісаных у 1980 – 1990-х гг., з адлюстраваннем фашысцкага палону, падпольнай і партызанскай барацьбы, што звязана з агульнай тэндэнцыяй да абнаўлення беларускай ваеннай прозы канца ХХ ст. праз акцэнтавана-фактаграфічны або пераствораны вопыт рэальнага суб’екта;

– забяспечана метадалагічная база для далейшага вывучэння эвалюцыі ваеннай тэмы ў жанры аповесці з улікам сучасных інтэрпрэтацый літаратуры ХХ і ХХІ стст.

**Метады даследавання**

У аснове працы – пастулаты культурна-гістарычнага, параўнальна-гістарычнага метадаў, прыёмы цэласнага аналізу мастацкага тэксту, што дало магчымасць вылучыць вядучыя тэндэнцыі і формы раскрыцця ваеннай тэмы ў спадчыне пісьменнікаў-ветэранаў, сведкаў і ахвяр ваенных падзей, а таксама вызначыць творчыя пазіцыі абраных для разгляду аўтараў з улікам змены гісторыка-культурнай парадыгмы.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Для выяўлення эвалюцыі ваеннай тэмы ў жанры аповесці прэзентатыўнай з’яўляецца проза наступных беларускіх пісьменнікаў-ветэранаў, творча актыўных у 1980 – 1990-я і пазнейшыя гады: А. Асіпенкі, М. Аўрамчыка, В. Быкава, А. Карпюка, А. Кулакоўскага, І. Навуменкі, І. Новікава, А. Савіцкага, І. Шамякіна, а таксама маладзейшых удзельнікаў і ахвяр вайны: А. Адамовіча,

Н. Гілевіча, У. Дамашэвіча, В. Казько, У. Ліпскага, Б. Сачанкі. Асаблівая інфарматыўнасць новых аповесцей названых пісьменнікаў звязана з тым, што яны напісаны ва ўмовах распаду СССР і станаўлення сучаснай культурнай і літаратурнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

2. Аўтары сучаснай беларускай аповесці пра Вялікую Айчынную вайну працягнулі тыя традыцыі айчыннай ваеннай прозы, што распрацоўваліся, пачынаючы з першай трэці XX ст. і да 1970-х гг., М. Гарэцкім, Я. Коласам, З. Бядулем, М. Чаротам, Я. Нёманскім, М. Зарэцкім, М. Лыньковым, Я. Скрыганам, Б. Мікулічам, Я. Брылём, Л. Арабей, А. Васілевіч, А. Кудраўцом, А. Марціновічам, І. Пташнікавым, М. Стральцовым, К. Чорным, інш. Вядучым напрамкам эпохі ў беларускай аповесці XX ст. пра вайну застаўся рэалізм, хоць вельмі значны след пакінулі здабыткі рамантызму, мадэрнісцкіх літаратурных плыняў і авангарду, а на зыходзе 1920-х – у 1950-я гг. ключавыя пазіцыі заняў артадаксальны сацыялістычны рэалізм. Сярод прозы названых аўтараў асаблівую вагу маюць аповесці з аўтабіяграфічным пачаткам, што зробіцца асноўным у далейшым развіцці ваеннай тэмы пакаленнем «шасцідзясятнікаў»-ветэранаў на зыходзе XX ст.

3. Эвалюцыя ідэйна-эстэтычных канцэпцый беларускіх празаікаў-ветэранаў у аповесцях 1980 – 1990-х гг. адбывалася ў кірунку да больш падрабязнага, разгалінаванага і паглыбленага адлюстравання трагічных бакоў быцця чалавека ва ўмовах фронту (В. Быкаў, І. Навуменка), партызанскай вайны (А. Адамовіч, А. Асіпенка, В. Быкаў, Н. Гілевіч, А. Карпюк, А. Кулакоўскі, І. Навуменка, І. Шамякін), дзейнасці антыфашысцкага падполля ў Беларусі (В. Быкаў, У. Дамашэвіч, І. Навуменка, І. Новікаў), фашысцкага палону ў лагерах на тэрыторыі Беларусі або за яе межамі (М. Аўрамчык, В. Казько, Б. Сачанка). Эвалюцыя жанравай формы аповесці ў творах канца XX ст. прасочваецца ў наступных аспектах: развіццё форм наратыву і псіхалагізму (А. Адамовіч, В. Быкаў, Н. Гілевіч, Б. Сачанка), паэтыкі магічнага рэалізму (В. Казько), антыўтопіі (А. Адамовіч), зварот да дакумента з выкарыстаннем журналісцкіх стратэгій (А. Адамовіч, А. Асіпенка, У. Дамашэвіч, А. Карпюк, А. Кулакоўскі, У. Ліпскі, І. Новікаў).

4. У шэрагу аповесцей М. Аўрамчыка, У. Дамашэвіча, А. Карпюка, А. Кулакоўскага, У. Ліпскага, І. Новікава, А. Савіцкага, напісаных у 1980 – 1990-х гг. на аўтабіяграфічным матэрыяле часоў Вялікай Айчыннай вайны, у той ці іншай ступені выявіліся захаваныя аўтарамі ідэйныя і фармальна-эстэтычныя ўстаноўкі савецкай літаратуры часоў строга-нарматыўнага сацыялістычнага рэалізму. У гэтых аповесцях, выдадзеных напярэдадні або пасля распаду СССР, вылучаюцца пазнакі ідэалагічна-партыйных арыенціраў 1940 – 1950-х гг.: ролевы набор персанажаў з адназначнымі сюжэтнымі функцыямі, бінарная прырода канфліктаў, элементы рамантызацыі, меладраматызацыі станоўчых і спрошчанасці адмоўных вобразаў-характараў, тэндэнцыя вяртання да жанравага ўзору «юнацкай аповесці», распаўсюджанай у прозе 1920-х гг.

5. Чалавечыя і матэрыяльныя страты беларусаў як нацыі ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны, асэнсаваныя ў аўтабіяграфічных аповесцях яе ветэранаў і відавочцаў, аказаліся надзвычай вялікімі, з немагчымасцю іх сутнаснай

кампенсацыі. Гэта прывяло да рэзкага росту экзістэнцыйнага светаадчування ў прозе А. Адамовіча, А. Асіпенкі, В. Быкава, В. Казько, І. Навуменкі, Б. Сачанкі ў 1980-я і пазнейшыя гады. Экзістэнцыйная мастацкая пазіцыя рэалізавалася не толькі ў праўдзівых сюжэтах, але і ў пафасе асуджэння вайны як непапраўнай трагедыі, прычым у маштабах не толькі асобы, генерацыі, нацыі, але і ўсёй супольнасці, зразуметай у філасофскім плане. Даследаваныя творы пацвярджаюць, што адназначна адмоўнае стаўленне тыповага беларуса ў XXI ст. да ваенных канфліктаў зрабілася трывалай пазнакай нацыянальнага характару – найперш праз траўматычны вопыт 1940-х гг.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Вынікі дысертацыйнага даследавання атрыманы аўтарам самастойна на падставе аналізу канцэпцый ваеннай рэчаіснасці, прадстаўленых у жанры ваеннай аповесці беларускіх аўтараў XX ст., а таксама вывучэння навуковай літаратуры па тэме дысертацыі. Дысертантам прааналізаваны тэндэнцыі адлюстравання ваенных калізій у жанры аповесці за перыяд 1980 – 1990-х гг. у цэласнасці і варыятыўнасці; вызначаны і ахарактарызаваны формы мастацкага ўвасаблення ваеннай тэмы ў творчасці беларускіх празаікаў-майстроў жанру аповесці; прасочаны і сістэматызаваны працэс раскрыцця ваеннай тэматыкі ў творчасці беларускіх пісьменнікаў з улікам прынцыпу гістарызму. Надрукаваныя артыкулы напісаны самастойна, без сааўтараў.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Асноўныя палажэнні дысертацыйнага даследавання прайшлі публічную апрабацыю ў якасці дакладаў на наступных міжнародных і рэспубліканскіх навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: I–III Міжнародных літаратуразнаўчых канферэнцыях «Руская, беларуская і сусветная літаратура: гісторыя, сучаснасць, узаемасувязі» (Наваполацк, 29 – 31 сакавіка 2002 г., 2 – 5 красавіка 2003 г., 8 – 10 красавіка 2004 г.); IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Літаратура – мова – культура» (Мінск, 18 – 19 чэрвеня 2004 г.); IV – V Міжнародных літаратуразнаўчых канферэнцыях «Руская, беларуская і сусветная літаратура: гісторыя, сучаснасць, узаемасувязі» (Наваполацк, 7 – 9 красавіка 2005 г., 12 – 14 красавіка 2007 г.); Міжнародным навуковым семінары «Рамана-германская філалогія ў кантэксце гуманітарных навук і праблемы падрыхтоўкі спецыялістаў» (Полацк, 10 – 11 красавіка 2009 г.); Міжнародным навуковым семінары «Гісторыка-тэарэтычная база сучасных літаратуразнаўчых даследаванняў» (Полацк, 9 – 10 красавіка 2010 г.); Чацвёртай Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гендэр і праблемы камунікатыўных паводзін» (Полацк, 28 – 29 кастрычніка 2010 г.); Міжнародным навуковым семінары «Слова – тэкст – кантэкст. Метады, спосабы і прыёмы аналізу мастацкага твора і літаратурнага працэсу» (Полацк, 6 – 7 мая 2011 г.); Міжнародным навукова-метадалагічным семінары «Філалагічныя дысцыпліны ва ўніверсітэцкай адукацыі: навука, метадалогія, методыка» (Полацк, 4 – 5 мая 2012 г.); Міжнародным навукова-метадалагічным семінары «Пошукі аптымальнай метадалогіі літаратуразнаўчых даследаванняў: перспектывы

гісторыка-кантэкстуальнага і іншых падыходаў да вывучэння літаратуры і мовы» (Полацк, 10 – 11 мая 2013 г.); Шостай Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Гендэр і праблемы камунікатыўных паводзін» (Полацк, 27 – 28 кастрычніка 2016 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Аксіялагічны дыяпазон мастацкай літаратуры» (Віцебск, 23 – 24 сакавіка 2017 г.); Міжнароднай канферэнцыі «Рэвалюцыі і грамадзянскія войны ў люстэрку сусветнай літаратуры» (Полацк, 26 – 27 кастрычніка 2017 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «XXV Гарэцкія чытанні. Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць» (Мінск, 22 чэрвеня, 2017 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў «Чалавек, Радзіма, свет у мастацкай прасторы Васіля Быкава» (Віцебск, 10 кастрычніка 2018 г.); III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Нацыянальныя культуры ў міжкультурнай камунікацыі» (Мінск, 12 – 13 красавіка 2018 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «XXVI Гарэцкія чытанні. Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць» (Мінск, 19 красавіка, 2018 г.); Рэгіянальнай (з міжнародным удзелам) навукова-практычнай канферэнцыі «Навукова-метадычная думка на Беларусі» (Віцебск, 5 снежня 2018 г.); IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Нацыянальныя культуры ў міжкультурнай камунікацыі» (Мінск, 11 – 12 красавіка 2019 г.); I Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Мова і міжкультурная камунікацыя: сучасныя вектары развіцця» (Пінск, 12 красавіка 2019 г.); X Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў» (Мінск, 12 – 13 верасня 2019 г.); IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Філалагічныя і сацыякультурныя пытанні навукі і адукацыі» (Краснадар, 25 кастрычніка 2019 г.); V Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Нацыянальныя культуры ў міжкультурнай камунікацыі» (Мінск, 31 сакавіка – 1 красавіка 2020 г.); 77-й навуковай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ (Мінск, 23 красавіка 2020 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Нацыянальны характар і спосабы яго ўвасаблення ў культуры і мове ва ўмовах мульцікультурнага асяроддзя» (Полацк, 19 – 20 лістапада 2020 г.). Агульная колькасць канферэнцый – 27.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

По тэме дысертацыі апублікавана 31 праца, у тым ліку 16 артыкулаў у навуковых крыніцах, рэкамендаваных ВАК Беларусі (9 арк.); 8 публікацый у навуковых зборніках (3 арк.); 7 публікацый матэрыялаў навуковых канферэнцый (2,1 арк.). Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў складае 14,1 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб'ём дысертацыі**

Праца складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, які налічвае 353 найменні прац айчынных і замежных аўтараў, з якіх 31 – публікацыі суіскальніка, двух дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі складае 179 старонак. Асноўны тэкст займае 137 старонак, бібліяграфічны спіс – 25 старонак, дадаткі – 17 старонак.

# АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Першая глава **«Традыцыі адлюстравання ваенных падзей у аўтабіяграфічнай беларускай аповесці XX ст.»** складаецца з двух раздзелаў.

У раздзеле 1.1 ***«Месца ваеннай тэмы ў беларускай літаратуры XX ст.»*** падкрэсліваюцца вытокі названай тэмы ў жанры аповесці, прысвечанай узброеным канфліктам першай трэці XX ст. У 1940-я гг., з развіццём ва Усходняй Еўропе падзей Другой сусветнай, гэтая вайна пачала адлюстроўвацца ў літаратурах усіх народаў СССР як менавіта Вялікая Айчынная – вайна савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у тым ліку ў жанры аповесці такіх беларускіх аўтараў, як М. Лынькоў, Б. Мікуліч, К. Чорны, І. Гурскі, А. Стаховіч, Х. Шынклер. З тых часоў тэма барацьбы з фашызмам у беларускай літаратуры толькі паглыбляецца і пашыраецца, не сыходзячы з парадку дня.

У раздзеле 1.2 ***«Беларуская аповесць 1980 – 1990-х гг. пра Вялікую Айчынную вайну ў ацэнках даследчыкаў»*** засяроджана ўвага на значнасці тых этапных адкрыццяў у працах пра ваенную аповесць (культурна-гістарычнага і кампаратыўнага характару), што былі створаны беларускімі навукоўцамі ў савецкі і пазнейшыя часы. Акрэслены літаратуразнаўчыя падыходы да названай праблемы ў працах А. Адамовіча, Д. Бугаёва, П. Васючэнкі, Т. Грамадчанка, П. Дзюбайлы, В. Каваленкі, В. Локун, Е. Лявонавай, М. Мушынскага, М. Тычыны, І. Шаблоўскай, Т. Шамякінай; пракаментаваны даследаванні аповесцей А. Адамовіча ва ўспамінах А. Бачылы, В. Каваленкі, у працах А. Бельскага, Д. Бугаёва, А. Бярозкі, В. Ганчарова, А. Данільчык, А. Крыклівец, Н. Нарынкевіч, Т. Тарасавай, М. Тычыны; акцэнтавана ўвага на грунтоўных працах, прысвечаных разгляду мастацкай спадчыны І. Навуменкі, – Л. Піскун, Т. Грамадчанка, Я. Клімуця, А. Марціновіча, М. Мікуліча, М. Мішчанчука, С. Паўлавіцкай, Г. Тычко; звернута ўвага на featured разгляд аповесцей В. Быкава ў айчыннай крытыцы апошніх дзесяцігоддзяў: у працах Л. Алейнік, І. Афанасьева, Д. Берастоўскай, В. Вабішчэвіч, І. Воюш, Г. Дашкевіч, І. Дзядкова, Л. Ляляка, Г. Няфагінай, Д. Пашкевіч, А. Рыўкінда, А. Сідаравай, А. Слабкоўскай, М. Смяглікавай, С. Тарасавай, З. Траццяк, І. Часнок, А. Шагалава, І. Шаладонава, С. Шапрана, Т. Швец, Л. Ярошка, інш.; прааналізаваны навуковыя набыткі, прысвечаныя творчасці В. Казько – у працах Т. Барабаншчыкавай, В. Вашчылінай, Г. Друк, Н. Ігруновай, Т. Нуждзіной, А. Федарэнкі, інш.; акцэнтаваны літаратуразнаўчыя «лакуны»: неабходнасць падагульнення, сістэматызацыі і працягу зробленага навукоўцамі-папярэднікамі ў асэнсаванні беларускай аповесці менавіта познесавецкіх і паслясавецкіх часоў на тэму Вялікай Айчыннай вайны з пазіцый сучаснасці.

Другая глава **«Этапы ідэйна-мастацкай эвалюцыі беларускай аповесці 1920 – 1970-х гг. пра вайну ў гісторыка-культурным кантэксце»** складаецца з трох раздзелаў і прысвечана выяўленню мастацкай спецыфікі ваеннай аповесці ў творчасці беларускіх пісьменнікаў-ветэранаў і відавочцаў Вялікай

Айчыннай вайны з дзвюх генерацый: а) народжаных у 1910-я гг.; б) народжаных у 1920 – 1940-я гг.

У раздзеле 2.1 ***«Ідэйна-эстэтычныя дамінанты ў беларускай аповесці пра вайну аўтарства старэйшых пісьменнікаў, народжаных на зыходзе XIX ст. і ў 1910-я гг.»*** на матэрыяле прозы перыяду 1920 – 1930-х гг. вылучаюцца тыя традыцыі ў паказе вайны, што былі закладзены беларускімі класікамі ў часы ад нашаніўцаў да ўзвышаўцаў. Адзначаецца, што ад гэтага вопыту адгалінавалася аповесць пра вайну А. Вольнага, А. Александровіча, А. Дудара, Р. Мурашкі, М. Паслядовіча, Э. Самуйлёнка, П. Галавача, У. Карпава, А. Кулакоўскага, С. Грахоўскага, М. Лупсякова, А. Асіпенкі, інш. Канстатуецца, што ў творах названай пісьменніцкай кагорты класічны рэалізм, элементы рамантызму і іншых стыляў эпохі пры адлюстраванні ваенных падзей саступілі месца сацыялістычнаму рэалізму.

У раздзеле 2.2 ***«Канцэптуальная скіраванасць ваеннай аповесці творцаў, народжаных у 1920 – 1940-я гг.»*** выяўлена максімальная ўспрымальнасць аўтараў названай генерацыі да гістарычных зрухаў. Пісьменнікі больш аператыўна, чым старэйшыя паплечнікі, рэагавалі на змены ў грамадстве, звязаныя з «хрушчоўскай адлігай» пасля 1956 г., і стварылі ўласную інтэрпрэтацыю ваеннай рэчаіснасці ў жанры аповесці. Тэксты вызваляліся ад элементаў фрагментарнасці, схематызму, павярхоўнай рамантызацыі ваенных падзей на карысць паглыблена-рэалістычнага, а затым экзістэнцыйнага паказу ваенных сітуацый, узмацнення псіхалагічнага пачатку. Гэты працэс абнаўлення ішоў паступова, эвалюцыйна, па-рознаму для кожнага з аўтараў аповесцей, сярод якіх: А. Карпюк, А. Марціновіч, І. Шамякін, А. Васілевіч, Л. Арабей, В. Быкаў, А. Савіцкі, І. Навуменка, А. Адамовіч, У. Дамашэвіч, У. Паўлаў, А. Кудравец, П. Місько, Я. Каршукоў, В. Казько, Б. Сачанка, І. Пташнікаў, М. Стральцоў.

У раздзеле 2.3 ***«Акцэнтаваная дакументальная аснова як вызначальны фактар у абнаўленні паэтыкі аповесці пра вайну ў 1960 – 1970-я гг. аўтарамі з розных пакаленняў»*** даследуюцца аўтабіяграфізм і фактаграфічнасць як першааснова наратыву беларускай аповесці пра вайну ў другой палове XX ст. Падкрэсліваецца выкарыстанне пісьменнікамі дакумента ў функцыі мастацкага вобраза. Канцэптуальнае развіццё атрымалі ідэі кніг «Ніколі не забудзем» (1948, мастацкі запіс дзіцячых сведчанняў пра вайну, зроблены М. Лыньковым і П. Рунцом), «Хатынская аповесць» (1971, А. Адамовіч), «Я з вогненнай вёскі…» (першае выданне – 1974, А. Адамовіч, Я. Брыль, У. Калеснік). Індывідуальны вопыт землякоў – ахвяр і відавочцаў ваенных трагедый, не прыхаваны ні аўтарскай самацэнзурай, ні рэдагуючымі інстанцыямі, з цягам часу робіцца ўсё больш важным для пісьменніка. Голас сведкі выходзіць на першы план, ён нібы супадае з голасам наратара. Гэты зрух найбольш відавочна выявіўся ў жанравым наватарстве А. Адамовіча і С. Алексіевіч («У вайны не жаночае аблічча», 1984; «Апошнія сведкі», 1985). Роля дакумента з’яўляецца першаснай таксама ў палемічных аповесцях І. Новікава (цыкл пра Мінскае

падполле), творах Г. Бураўкіна «Тры старонкі з легенды» (1971), С. Грахоўскага «Рудабельская рэспубліка» (1968), «Гарачае лета» (1974), інш. Такім чынам, факты і сведчанні зрабіліся асновай для чарговага эвалюцыйнага зруху ў жанры аповесці пра вайну ў другой палове XX ст.

Трэцяя глава **«Роля творчай індывідуальнасці пісьменніка-ветэрана ў развіцці беларускай ваеннай аповесці 1980 – 1990-х гг.»** складаецца з аднаго раздзела і пяці падраздзелаў.

У раздзеле 3.1 ***«Раскрыццё ваеннай тэмы ў аповесцях 1980 – 1990-х гг. пісьменнікамі-ветэранамі вайны з нямецкім нацызмам»*** аналізуецца проза, створаная напярэдадні і пасля распаду СССР. У гэты час аўтары-ветэраны выкарысталі магчымасць без цэнзуры былой дзяржавы давесці больш поўную праўду пра цану міру, заваяванага савецкім, у тым ліку беларускім народам, у 1945 г. Вызначальным у аповесцях большай часткі творцаў у 1980 – 1990-х гг. стаў паказ менавіта трагічнага і балючага: гэта дыктат жорсткасці і падазронасці да чалавека ў войску і пад нямецка-фашысцкай акупацыяй, стратэгічныя і тактычныя пралікі камандавання, што вельмі дэталёва ўзноўлена ў аповесцях В. Някрасава і В. Быкава, В. Кандрацьева і І. Навуменкі, В. Астаф’ева і А. Адамовіча, В. Распуціна і І. Шамякіна. Факты, расказаныя ў жанры ваеннай аповесці ўпершыню, сведчылі пра ўдакладненую ацэнку мінулага аўтарамі-ветэранамі. Акрамя таго, пісьменнікі-франтавікі (І. Шамякін) уздымалі праблему цяжкай адаптацыі ветэранаў да разбурэння соцыуму ў перыяд 1990-х гг. з-за страты савецкіх ідэалаў і былых адносін чалавека з дзяржавай.

У падраздзеле 3.2 ***«Традыцыйнае і наватарскае ва ўзнаўленні падзей вайны ў творах А. Кулакоўскага і А. Савіцкага»*** аргументавана прасочваецца ўзмацненне пафасу праўдзівасці ў прозе А. Кулакоўскага, што выявілася ў яго аповесцях «Белы Сокал» (1981), «Хлебарэз» (1983), «Маршрут ад Клічава» (1983). А. Кулакоўскі ў дэталях расказвае пра перажытае: гэта адлюстраванне побыту вайскоўцаў, штодзённага жыцця шараговага салдата падчас ваенных дзеянняў, знаходжання параненага ў шпіталі. Крытычна паказаны хібы савецкай бюракратычнай сістэмы, памылкі ў падрыхтоўцы вайсковых аперацый, цяжкая рэальная сітуацыя на фронце, жорсткія адносіны камандзіраў да падначаленых. У цэлым у аповесцях А. Кулакоўскага на першым плане выступіў прыватны, драматычны лёс асобнага чалавека, які ваяваў за агульную перамогу. А. Савіцкі ў аповесці «Белая знічка» (1984) ізноў звярнуўся да ўласнага вопыту, каб пацвердзіць адданасць ідэалам 1940-х гг., прыхільнасць да паэтыкі сацыялістычнага рэалізму. Адлюстраванне пісьменнікам прыроды подзвігу падначальваецца традыцыі рамантызацыі з увядзеннем як элементаў прыгоды, так і акцэнтаў на цынізме ворага. Светапоглядныя арыентацыі пісьменніка скіроўвалі яго на паказ яскравага гераізму падчас ваенных дзеянняў, традыцыйнае для савецкай літаратуры апісанне непахіснасці чалавека, адданага засвоеным ідэям. Жанравы канон аповесці абодва пісьменнікі ўзбагацілі арыгінальнымі прыёмамі рэтраспекцый, другаснай мастацкай умоўнасці (у сімвалічных снах персанажаў).

У падраздзеле 3.3 ***«Чалавек і абставіны: мастацкае вырашэнне праблемы ў аповесцях А. Карпюка і М. Аўрамчыка»*** вызначаюцца новыя тэматычныя ракурсы ў жанры аповесці пра вайну: тэма палону, вобраз немца, які цураецца фашызму. А. Карпюк на аўтабіяграфічным матэрыяле стварыў аповесць «Рэквіем» (1991), заснаваную ў асноўным на перажытым у фашысцкім канцлагеры Штутгоф. Падобны аўтабіяграфічны матэрыял (праца ў шахтах Рура савецкіх ваеннапалоных) лёг у аснову і аповесці М. Аўрамчыка «Палон» (1991). «Рэквіем» А. Карпюка характарызуецца новым ракурсам у адлюстраванні партызанскай барацьбы: аўтар паказвае падзеі на былой польскай тэрыторыі. Узноўлены гістарычны кантэкст злучэння беларускіх земляў увосень 1939 г., згаданы палітычныя падзеі часоў Ю. Пілсудскага, вызначальныя для заходнебеларускага насельніцтва. Аповесць «Рэквіем» выглядае наватарскай найперш у параўнанні з папярэдняй аповесцю А. Карпюка «Партрэт» (1983 г.), у якой аўтар выступіў выразнікам прапагандысцка-савецкага светабачання: увасобіў жыццё, падобнае да мірнага, ідэалізаваных салдат-сялян у партызанскай зоне каля ракі Дрыса. Таксама ў аповесці «Партрэт» паказана ўнутранае перараджэнне палоннага нямецкага лётчыка-штурмана, былога апантанага прыхільніка ідэалогіі фашызму. У мадэлі светабудовы М. Аўрамчыка (аповесць «Палон») у адмысловым сінтэзе спалучыліся станоўчыя і цяжкія, экзістэнцыйныя моманты перажытага. Прысутнасць унутранага цэнзара, асцярожнасць і насцярожанасць аўтара «Палону» тлумачыцца псіхалогіяй чалавека, які правёў у няволі найцяжкія гады, звязаныя з прымусовай працай і прыгнётам духу. Аповесці М. Аўрамчыка і А. Карпюка істотна пашыраюць тэматычны і аналітычны дыяпазон беларускай прозы 1990-х гг. пра ваеннае мінулае.

Падраздзел 3.4 ***«Матыў ахвярнасці ў аповесцях І. Шамякіна і І. Новікава»*** прысвечаны даследаванню аповесці І. Шамякіна («Ахвяры», 1990) і І. Новікава («Рыжая Галка», 1990). І. Шамякін па-мастацку асвятляе тыя злачынствы, што рабіліся прадстаўнікамі «асобых» атрадаў, закінутых у Беларусь для разгортвання партызанскага руху. Гэтую тэму да часоў перабудовы і галоснасці ў СССР айчынная літаратура магла закранаць толькі фрагментарна, выяўляючы драматызм жыцця на беларускай зямлі, акупаванай фашыстамі (падобныя матывы знаходзім у прозе «шасцідзясятнікаў», напрыклад, у вядомым рамане І. Шамякіна «Сэрца на далоні», 1964). У «Ахвярах» І. Шамякін застаецца мастаком-даследчыкам самых вострых грамадскіх праблем, што заўсёды падкрэслівалася беларускай крытыкай. І. Новікаў вядомы як аўтар прозы нарысавага характару, якая стала папулярнай з-за вострай тэматыкі – рэабілітацыі антыфашысцкага падполля Мінска. У аповесці «Рыжая Галка» працягваецца гэтая тэма. Пісьменнік намаляваў вобраз жанчыны, якая пасля вызвалення Беларусі вымушана прайсці праз штучна створаныя выпрабаванні бязлітасных службоўцаў. Ідэйна-мастацкім наватарствам у аповесцях І. Шамякіна і І. Новікава зрабілася ўвасабленне тэмы

рэабілітацыі (юрыдычнай, сацыяльнай і маральнай) чалавека, незаслужана абвешчанага ворагам у 1940-я – перш. пал. 1950-х гг. У эстэтычным плане гэтыя аповесці дэманструюць сталыя рысы аўтарскай манеры абодвух аўтараў. І. Шамякін выступае майстрам глыбокага, яскравага ўзнаўлення рэчаіснасці; у аповесці І. Новікава «Рыжая Галка» заўважныя элементы публіцыстычнага пафасу, вопыт дакументаліста.

У падраздзеле 3.5 ***«Трансфармацыя мастацкіх катэгорый і вобразаў пры асваенні ваеннай тэмы В. Быкавым»*** даказваецца, што ў 1980 – 1990-я гг. пісьменнік засяродзіўся на выяўленні трагічнай безвыходнасці ў лёсе мірнага жыхара-беларуса, які трапляе ў жорны вайны. Пры гэтым палемічны пафас В. Быкава зменшыўся і амаль цалкам саступіў экзістэнцыйна-засмучанаму. Дамінуючым зрабілася імкненне раскрываць найперш уласнабеларускі, гістарычна-канкрэтны вопыт Вялікай Айчыннай вайны ў экзістэнцыйным плане. У самім жанры быкаўскай аповесці таксама адбылася эвалюцыя. Рух да раманнага мыслення, што адзначаўся даследчыкамі ў аповесці «Знак бяды» (1982), з непасрэдным адлюстраваннем сувязі розных гісторыка-культурных эпох, перажытых беларусамі ў першай палове ХХ ст., заўважны таксама ў аповесцях «Кар'ер» (1985), «Сцюжа» (1991). Тым не менш, В. Быкаў напрыканцы жыцця вярнуўся да той жанравай формы сваёй аповесці, якая мае статус класічнай: з абмежаванай колькасцю персанажаў і лаканізмам у сюжэтабудаванні. Такімі аповесцямі позняга В. Быкава з'яўляюцца «У тумане» (1988), «Пакахай мяне, салдацік» (1996), «Балота» (2001), «Бліндаж» (няскончаная, пачата ў 1987, надрукавана ў 2006). Мастак на сыходзе жыцця пісаў пра ўласнае спасціжэнне дабра і зла на вайне ўжо цалкам адкрыта (аповесць-мемуары «Доўгая дарога дадому», 2003), узмацняючы сваю традыцыйную думку пра неабходнасць маральна-этычных імператываў для кожнай асобы. Хрысціянскія матывы, якія значна паглыбіліся ў позніх творах В. Быкава, адсылаюць да новага месца рэлігіі ў светапоглядзе постсавецкага чалавека.

У падраздзеле 3.6 ***«Новыя ракурсы асэнсавання падзей вайны ў аповесцях І. Навуменкі»*** ўвага засяроджваецца на традыцыйнай для пісьменніка сюжэтна-кампазіцыйнай мадэлі, аўтабіяграфічным апавядальным ладзе, якія захоўваюцца мастаком у жанры аповесці. Трылогія аповесцей «Дзяцінства» (1991), «Падлетак» (1993), «Юнацтва» (1994), а таксама творы «Гасцініца над Прыпяццю» (1994), «Любімы горад» (1996), «Дзясяты клас» (1998), «Помні Сталінград» (2000) паяднаны шэрагам матываў, традыцыйных для аўтара, чыё юнацтва было ахвяравана вайне. Гэта такія матывы, як сутыкненне наіўнага школьніка з жорсткасцю і натуралізмам вайны, страта ілюзій савецкім юнаком, яго вернасць ідэалам сумленнасці, сяброўства, самаадданай працавітасці, цікаўнасці да ўсяго новага і незнаёмага, а таксама да гісторыі ўласнай краіны і дзяржавы, дзе прайшло жыццё. Прынцып аўтабіяграфізму як аўтарская стратэгія дазволіў пісьменніку вельмі канкрэтна і дакладна адлюстраваць праявы і пазітыўнага, і негатыўнага ў мінулым, і гэтая агульназначная праўда

савецкага часу забяспечвае наватарскі змест разгледжаных твораў І. Навуменкі. На фоне дамінуючай у савецкай літаратуры ўвагі да народа як масы аўтар падкрэслівае індывідуальнасць чалавека, лепшыя рысы беларускага характару. Тужлівыя інтанацыі ў апошніх аповесцях І. Навуменкі звязаны не столькі з філасофскай пазіцыяй аўтара, колькі са згадкамі канкрэтных рэалій, гібелі на вайне «хлопцаў-равеснікаў».

Чацвёртая глава **«Адлюстраванне ваеннай тэмы ў аповесцях 1980 – 1990-х гг. пісьменнікамі з пакалення відавочцаў вайны»** складаецца з чатырох раздзелаў.

У раздзеле 4.1 ***«Формы рэпрэзентацыі ваеннага кантэксту ў аповесцях А. Асіпенкі і А. Адамовіча»*** раскрываецца паглыбленне трагічнага пафасу ў жанрава традыцыйных аповесцях А. Асіпенкі: праз мастацкае асэнсаванне пісьменнікам-ветэранам даваеннай сталінскай палітыкі, а таксама лёсаў яе «выканаўцаў» у ваенны час, калі расправы над людзьмі не спыняліся. Кошт шматлікіх неапраўданых ахвяр з савецкага боку ў барацьбе з нямецкім фашызмам падкрэслены аўтарам праз рэплікі і маналогі персанажаў, адметную мастацкую дэталь (аповесць «Выканаўца», 1994). У аповесцях «Цыркачка і маёр» (1992) і «Клетка для берасцянак» (1993) ва ўмовах мастацкага разняволення 1990-х гг. А. Асіпенка паглыблена раскрыў тэму дэфармацый псіхалогіі чалавека з ваеннага пакалення: паказаў адмоўны вобраз ветэрана, малюючы абставіны паваеннага быцця.

А. Адамовіч у 1980 – 1990-я гг. працягнуў мастацкія эксперыменты ў жанры аповесці, пра што сведчаць творы «Апошняя пастараль» (1986, антыўтопія з трывогай за лёс чалавецтва ў свеце, поўным атамнай зброі), «Венера, або Як я быў прыгоннікам» (1988 – 1992, сюжэт з аўтарскімі адступленнямі-роздумамі пра лёс вясковай жанчыны пад акупацыяй і пасля яе), аўтабіяграфічная аповесць-дзённік «Vixi» («Пражыта», 1993), аповесць «Нямко» (1993, пра драму кахання беларускі Паліны і немца Франца ў акупаванай фашыстамі Беларусі). Найбольш нечакана і смела прагучала аповесць «Карнікі» (1980, 1988), у якой створаны «ўнутраныя маналогі» забойцаў мірнага насельніцтва. Аднак ролю этычнага камертона А. Адамовіч у сваіх творах апошніх гадоў аддаў галасам цывільных беларусаў-ахвяр, якія прынялі пакутніцкую смерць падчас нямецкай акупацыі. Тым самым пісьменнік радыкальна змяніў ракурс для адлюстравання падзей Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі. Аповесці А. Адамовіча заснаваны на рэальных фактах і часта ўтрымліваюць пашпартызаваныя фрагменты дакументальных матэрыялаў. Тэксты пісьменніка ўскладненыя па форме, шматфарбныя за кошт ужытых малюнкаў сноў, трызненняў, фрагментаў плыні свядомасці ў рэфлексіі асобных персанажаў. Адказваючы на пытанні пра трансфармацыю каштоўнасных арыентацый чалавека, творчая спадчына А. Адамовіча стала працягам інтэлектуальнай літаратуры 1970-х гг.

У раздзеле 4.2 ***«Функцыянальнасць дакументальнай асновы ў ваеннай аповесці У. Дамашэвіча і У. Ліпскага»*** выяўлена, што для абодвух пісьменнікаў

вызначальным зрабіўся журналісцкі або рэдактарскі вопыт, які лёг у аснову іх мастацкай творчасці. У аповесці У. Дамашэвіча («Кожны чацвёрты», 1983) заўважны таксама ўплыў мастацкага вопыту В. Быкава па стварэнні вострых канфліктаў у сітуацыях выбару. Грамадзянскую смеласць У. Дамашэвіч выявіў у дакументальна-мастацкай аповесці «Першым заўсёды цяжка» (1986, у сааўтарстве з У. Сазановічам). Твор прысвечаны Клецкаму антыфашысцкаму падполлю. Падобныя тэмы ў савецкі час кантраляваліся: былі звязаны з абавязковай праверкай на сапраўднасць усіх фактаў і сюжэтаў з часоў нямецкай акупацыі Беларусі. У. Дамашэвіч, сцвярджаючы подзвіг беларускіх падпольшчыкаў, у гэтай аповесці ў выяўленчым плане вярнуўся да традыцый сацыялістычнага рэалізму. Тым не менш, пісьменнік абвастрыў сюжэтныя калізіі, паказаў трагічныя сітуацыі першых дзён акупацыі Беларусі фашыстамі, непазбежнасць ахвяр сярод цывільнага насельніцтва. Даследаванне прозы У. Ліпскага прывяло да выяўлення наступнай яе эвалюцыі: ад дзённікавых запісаў, гістарычных нарысаў да дакументальна-мастацкай (у тым ліку, і ваеннай) аповесці. У аснову аповесцей «Крутыя вёрсты» (1985) і «Пралескі ў небе» (1985) ляглі жанрава-стылёвыя каноны літаратуры сацыялістычнага рэалізму: гераізацыя персанажаў з рэальнымі прататыпамі (Герой Савецкага Саюза, медсястра З. Тусналобава-Марчанка, лётчык А. Мамкін, які загінуў пры выратаванні дзяцей з Полацкага дзіцячага дома). Арыентацыя на юнацкую аўдыторыю і выхаваўчую місію літаратуры зрабіла вызначальным у творчасці У. Ліпскага пафас з элементамі меладраматызму. Замацаванне вобразаў мужнасці і самаахвярнасці чалавека на вайне адбывалася дзякуючы выкарыстанню пісьменнікам праўды дакумента.

У раздзеле 4.3 ***«Аўтабіяграфічны пачатак у адлюстраванні падзей вайны ў творчасці Н. Гілевіча і Б. Сачанкі»*** раскрываецца эвалюцыя пісьменнікаў у пошуках формы адлюстравання ваеннага кантэксту. Архітэктоніка аповесці Н. Гілевіча «Перажыўшы вайну: аповесць у абразках памяці» (1988, 2013) з'яўляецца нізкай навелістычных раздзелаў: знешне яны выглядаюць гісторыяй сталення дзіцяці, а па сутнасці з'яўляюцца формай незаангажаванага ўзнаўлення рэчаіснасці праз наіўны погляд, сінхронна дапоўнены ацэнкай сталага чалавека. Н. Гілевіч, фактычна, абнавіў мастацкую форму «абразкоў», выкарыстаўшы ў жанры аповесці іх вельмі свабодную, эсэістычную стылістыку. Гісторыя роднай пісьменніку Лагойшчыны разам з іншымі вёскамі гэтага рэгіёна, спаленымі карнікамі разам з людзьмі падчас акупацыі, адноўлена пісьменнікам у змесце твора. Для Б. Сачанкі перыяд 1980 – 1990-х гг. зрабіўся чарговым этапам асэнсавання быцця з пазіцый рэтраспектыўнага звароту да ваеннай тэматыкі. Гэтае асэнсаванне назіралася ў аповесцях 1960 – 1970-х гг. («Апошнія і першыя», «Аксана», «Палон», «Загадка аднаго падполля»), было працягнута ў жанры рамана («Чужое неба», 1969 – 1973; «Вялікі лес», 1976 – 1982), а затым – у аповесцях 1980-х гг. («Дарога ў Хатынь», «Забытыя селішчы», «Еўка», «Незваротнае») і выніковай аўтабіяграфічнай аповесці 1992 г. «Засталіся толькі ўспаміны». Пісьменнік, які перажыў гібель у агні аднавяскоўцаў, выгнанне і паднявольную

працу на чужыне, нялёгкае вяртанне ў Беларусь, у сваіх аповесцях выкарыстаў эпізоды ўласнай драматычнай біяграфіі. Аповесць «Засталіся толькі ўспаміны», уключаная ў пасмяротны зборнік «Пад сузор'ем сярпа і молата» (2016), замацавала змены ў апавядальным тоне Б. Сачанкі: у ім загучалі абвострана-экзістэнцыйныя, трагічныя ноты. У аповесцях Б. Сачанкі мастацкае асэнсаванне ваеннага быцця праходзіць эвалюцыю ад апісання пэўнага факта, сітуацыі да паглыблення ў іх псіхалагізму, самых трагічных і балючых сэнсаў і вынікаў для лёсу чалавека.

Раздзел 4.4 ***«Мадыфікацыя ваеннай тэмы ў псіхалагічнай прозе В. Казько»*** прысвечаны вызначэнню эвалюцыйных змен у аповесцях пісьменніка. Гэта творы В. Казько «І нікога, хто ўбачыць мой страх» (першая назва – «Да сустрэчы»), «Час збіраць косці» (з падзагалоўкам «Евангелле пад Луку»), «Прахожы». Усе яны былі напісаны ў 1990-я гг. і аб'яднаны ў кнізе «Час збіраць косці» (2014). Для названых тэкстаў характэрна засяроджанасць аўтара на тых канфліктах, якія абумоўлены глабальнымі прычынамі. Пісьменнік узмацняе аналітычны пафас, фіксуе апакаліптычныя матывы і адпаведныя зрухі ў чалавечай свядомасці. Герой В. Казько нярэдка вяртаецца ў памяці да псіхічнай і маральнай траўмы, атрыманай у фашысцкім канцлагеры для дзяцей-донараў, да жахлівых малюнкаў з часоў акупацыі, што адбіліся ў дзіцячай свядомасці назаўсёды. У аповесці «Час збіраць косці» да ўзнаўлення падзей перыяду Вялікай Айчыннай вайны дадаюцца паралельна згадкі пра вайну ў Афганістане, узброеныя канфлікты ў Арменіі і Чачні, пра новыя ахвяры на «вайне» з наступствамі выбуху на Чарнобыльскай АЭС. У плане паэтыкі В. Казько развівае свае прыёмы расслаення свядомасці персанажа, звароты да міфалогіі, наіўнага касмізму, да беларускіх вераванняў і пантэістычнага светаадчування, што адсылае чытача да стылістыкі магічнага рэалізму. Пісьменнік таксама ўсё больш актыўна выкарыстоўвае свабодныя асацыяцыі разам з пашырэннем тэматычных абсягаў. Усё гэта развівае і саму жанравую форму аповесці.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Падзеі Вялікай Айчыннай вайны для Беларусі з'яўляюцца адным з глабальных фактараў яе гісторыі ў ХХ ст., яны ў многім прадвызначылі вобраз Рэспублікі Беларусь у сусветнай супольнасці. Вывучэнне ваеннай тэмы ў беларускай мастацкай літаратуры заканамерна грунтуецца на тэкстах тых аўтараў, якія маюць уласны вопыт удзелу ў супрацьборстве з фашызмам на фронце, пад акупацыяй, у нямецкім палоне. Для выяўлення эвалюцыі асэнсавання падзей Вялікай Айчыннай вайны ў жанры аповесці прэзентатыўнай з'яўляецца проза наступных беларускіх пісьменнікаў-ветэранаў, актыўных у 1980 – 1990-я і пазнейшыя гады: А. Асіпенкі, М. Аўрамчыка, В. Быкава, А. Карпюка, А. Кулакоўскага, І. Навуменкі, І. Новікава, А. Савіцкага, І. Шамякіна, а таксама маладзейшых удзельнікаў і ахвяр вайны:

А. Адамовіча, Н. Гілевіча, У. Дамашэвіча, В. Казько, У. Ліпскага, Б. Сачанкі. Асаблівая інфарматыўнасць новых аповесцей названых пісьменнікаў звязана з тым, што яны напісаны ва ўмовах распаду СССР і станаўлення сучаснай культурнай і літаратурнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Найбольш успрымальнымі да гістарычных зрухаў сталі аўтары з пакалення, народжанага ў 1920 – 1940-я гг.: яны сустрэлі Вялікую Айчынную яшчэ юнакамі, падлеткамі, дзецьмі. Гэтыя беларускія пісьменнікі на мяжы XX – XXI стст. фактаграфічна і канцэптуальна абнавілі карціну духоўнага досведу беларусаў, створаную ў папярэднюю савецкую эпоху, на старонках сваіх аповесцей давялі больш поўную праўду пра найвялікшую цану міру, заваяванага суайчыннікамі – франтавікамі, партызанамі, падпольшчыкамі, цывільнымі жыхарамі Беларусі – у супрацьборстве СССР з нацысцкай Германіяй у межах Другой сусветнай вайны [13 – 16; 19; 22; 23; 31].

2. Беларуская аповесць пра вайну XX ст. (Першую сусветную, інш.) была прадстаўлена эстэтычна развітымі формамі ўжо ў 1920 –1930-х гг. Гэта былі рэалістычныя аповесці з аўтабіяграфічным пачаткам (М. Гарэцкі, Я. Колас, З. Бядуля), белетрыстычныя з маладнякоўскім пафасам (Я. Нёманскі), лірыка-псіхалагічнага і рамантызаванага характару (М. Зарэцкі, М. Лынькоў, Я. Скрыган, Б. Мікуліч), а таксама філасофска-аналітычнай скіраванасці (К. Чорны). Вядучым напрамкам эпохі ў беларускай аповесці XX ст. пра вайну застаўся рэалізм, хоць вельмі значны след пакінулі здабыткі рамантызму, мадэрнісцкіх літаратурных плыняў (З. Бядуля, М. Гарэцкі, К. Чорны) і авангарду (А. Гародня), што на зыходзе 1920-х гг. паступова саступілі месца сацыялістычнаму рэалізму (Я. Колас, М. Лынькоў, К. Чорны). Закладзеным традыцыям наследавалі аўтары аповесцей пра Вялікую Айчынную вайну, натхнёныя эпохай 1960-х гг. Сярод іх аўтабіяграфічным пачаткам вылучаюцца аповесці Л. Арабей, А. Васілевіч, А. Кудраўца, А. Марціновіча, І. Пташнікава, М. Стральцова, у якіх прысутнічае інтэнцыя да паглыблення праўдзівасці і трагічнага пафасу ў асэнсаванні гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, што зрабілася магістральным кірункам у развіцці ваеннай тэмы «шасцідзясятнікамі»-ветэранамі на зыходзе XX ст.: А. Адамовічам, А. Асіпенкам, В. Быкавым, І. Навуменкам, І. Шамякіным. Вызначальным у пазнейшай творчасці большай часткі ўсіх славутых савецкіх пісьменнікаў-ветэранаў стаў рост увагі як да «акопнай праўды», так і да «праўды Стаўкі». Гэта паказ таго становішча на франтах, якое характарызавалася фатальнай непазбежнасцю лішніх людскіх страт: з-за пралікаў у камандаванні, праяў дыктату жорсткасці і падазронасці да чалавека ў войску і пад нямецка-фашысцкай акупацыяй, непадрыхтаванасці маладых байцоў, адсутнасці аператыўнага забеспячэння належнай зброяй, што вельмі дэталёва ўзноўлена ў аповесцях такіх рускіх і беларускіх аўтараў, як В. Някрасаў і В. Быкаў, В. Кандрацьеў і І. Навуменка, В. Астаф'еў і А. Адамовіч, В. Распуцін і І. Шамякін. Факты, расказаныя ў жанры ваеннай аповесці ўпершыню, сведчылі пра ўдакладненую ацэнку пісьменнікамі-ветэранамі былых кіраўнікоў, камандзіраў, розных варыянтаў ваеннага становішча, а таксама сітуацый у тыле ворага. Акрамя таго, пісьменнікі

ўздымалі праблему цяжкай адаптацыі ветэранаў да абставін сучаснасці: разбурэння соцыуму ў перыяд 1990-х гг. (В. Казько), адмаўлення ад савецкіх ідэалаў і былых адносін чалавека з дзяржавай (І. Шамякін). В. Казько па-мастацку арыгінальна вырашыў праблемы існавання чалавека ў постсавецкую эпоху, аднак па тэматычным і настраёвым абсягу яго творы падобны да ўспрымання рэалій І. Шамякіным, які падкрэслена гіпербалізаваў адмоўнае стаўленне да постсавецкай рэчаіснасці не толькі ветэрана-ўдзельніка вайны, але і цывільнага чалавека. У перыяд разбурэння мінулых ідэалаў І. Шамякін крытычна і з болем выказаўся пра ніваліроўку імператываў савецкай эпохі. В. Казько па-свойму выяўляе матывы, што прагучалі ў аповесцях І. Шамякіна: пісьменнік асаблівую ўвагу надае псіхалогіі чалавека, ставіць у цэнтр увагі асобу, знявечаную ваеннымі абставінамі і незапатрабаванасцю ў постсавецкі перыяд [1 – 7; 9 – 22; 25 – 27; 29].

3. Эвалюцыя ідэйна-эстэтычных канцэпцый беларускіх празаікаў-ветэранаў у аповесцях 1980 – 1990-х гг. адбывалася ў кірунку да больш падрабязнага, разгалінаванага і паглыбленага адлюстравання трагічных бакоў быцця чалавека: ва ўмовах фронту і на зыходзе вайны – за межамі СССР («Белы Сокал», «Маршрут ад Клічава» А. Кулакоўскага; «Пакахай мяне, салдацік», «Доўгая дарога дадому» В. Быкава; «Дзясяты клас», «Помні Сталінград» І. Навуменкі), ва ўмовах гітлераўскай акупацыі і партызанскай вайны («Карнікі», «Нямко», «Венера, або як я быў прыгоннікам», «Vixi» («Пражыта») А. Адамовіча; «Выканаўца» А. Асіпенкі; «Знак бяды», «Бліндаж», «У тумане», «Пакахай мяне, салдацік», «Балота» В. Быкава; «Пеpажыўшы вайну. Аповесць у абразках памяці» Н. Гілевіча; «Час збіраць косці», В. Казько; «Бацька. Пісьмы сына» У. Ліпскага; «Гасцініца над Прыпяццю» І. Навуменкі; «Дарога ў Хатынь», «Забытыя селішчы» Б. Сачанкі; «Ахвяры» І. Шамякіна), дзейнасці антыфашысцкага падполля ў Беларусі («Кар'ер» В. Быкава; «Першым заўсёды цяжка» У. Дамашэвіча; «Гасцініца над Прыпяццю», «Юнацтва» І. Навуменкі; «Рыжая Галка» І. Новікава), фашысцкага палону ў лагерах на тэрыторыі Беларусі або за яе межамі («Палон» М. Аўрамчыка; «Рэквіем» А. Карпюка; «Еўка», «Незваротнае», «Засталіся толькі ўспаміны» Б. Сачанкі). Важным складнікам канцэптуальнай эвалюцыі пісьменнікаў у аповесцях з ваеннай тэмай зрабіўся зварот да непасрэднага адлюстравання сувязі розных гісторыка-культурных эпох, перажытых беларусамі ў ХХ ст. Пры гэтым на першы план выйшла раскрыццё трагічнай безвыходнасці ў лёсе мірнага жыхара-беларуса, які неаднаразова трапляе ў жорны вайны, што прывяло да росту філасофскіх матываў экзістэнцыялізму, абсалютнага трагізму чалавечага існавання (В. Быкаў, В. Казько, Б. Сачанка). Традыцыйны гуманістычны пафас у прозе беларускіх аўтараў спалучыўся з хрысціянскімі матывамі, якія зрабіліся больш глыбокімі ў позняй творчасці шэрагу аўтараў (В. Быкаў, В. Казько, І. Навуменка, Б. Сачанка), пачалі выконваць ролю своеасаблівых адсылак да новага месца рэлігіі ў светапоглядзе постсавецкага чалавека [13 – 16; 22; 23; 29 – 32].

4. Эвалюцыя жанравай формы аповесці, якая ў цэлым засталася ў межах эстэтычнай парадыгмы рэалізму, прасочваецца ў творах беларускіх

пісьменікаў-ветэранаў на зыходзе XX ст. у наступных аспектах: развіццё форм наратыву і псіхалагізму (мантаж у А. Адамовіча, псіхалагізаваная няўласна-простая мова ў А. Асіпенкі, В. Быкава, Б. Сачанкі, навелізацыя з рысамі эсэістыкі ў Н. Гілевіча), паэтыка магічнага рэалізму (В. Казько) і антыўтопіі (А. Адамовіч), зварот да дакумента з выкарыстаннем журналісцкіх стратэгій, са стылёвымі слядамі публіцыстыкі і нарыса (А. Адамовіч, А. Асіпенка, У. Дамашэвіч, А. Карпюк, А. Кулакоўскі, У. Ліпскі, І. Новікаў), «проза галасоў», заснаваная на пераствораным наратыве рэальных удзельнікаў або сведкаў ваенных злачынстваў (А. Адамовіч). Увага да ваеннай тэмы, пранесеная праз усё жыццё, імкненне да канкрэтнага, поўнага побытавых дэталей, адлюстравання чалавека на вайне – вось рысы, якія можна назваць вядучымі ў тых аповесцях 1980 – 1990-х гг., дзе захаваліся ідэйныя і фармальна-эстэтычныя ўстаноўкі савецкай літаратуры часоў строга-нарматыўнага сацыялістычнага рэалізму («Партрэт» А. Карпюка; «Белая знічка» А. Савіцкага, «Пяцёрка адважных» А. Асіпенкі; «Крутыя вёрсты», «Пралескі ў небе» У. Ліпскага; «Таварыш Ганс», «Двое з пякельнага бамбардзіроўшчыка» Ю. Высоцкага; «У кожнага – свая вайна», «Мядовачка» М. Дубоўскага). У названых аповесцях, выдадзеных напярэдадні або пасля распаду СССР, увасоблены ідэалагічна-партыйныя арыенціры 1940 – 1950-х гг. Гэта ролевы набор персанажаў з адназначнымі сюжэтнымі функцыямі, бінарная прырода канфліктаў, элементы рамантызацыі, меладраматызацыі станоўчых і спрошчанасці адмоўных вобразаў-характараў, тэндэнцыя вяртання да жанравага ўзору «юнацкай аповесці», распаўсюджанай у беларускай савецкай прозе 1920-х гг. Разам з тым у названых тэкстах адбылося істотнае пашырэнне фактаграфіі, вырасла майстэрства сюжэтабудовы, з'явіліся арыгінальныя літаратурныя вобразы выключных персанажаў, што мелі сваіх прататыпаў у рэальным жыцці (В. Казлоў як дзеючая асоба ў аповесці-мемуарах, запісаных А. Кулакоўскім, В. Корж у творы С. Грахоўскага, В. Харужая з аповесці І. Новікава, Н. Багданава ў творы Г. Бураўкіна, А. Кулагін – у Э. Скобелева, Я. Лагун і М. Сіліч з твора М. Аўрамчыка, З. Тусналобава-Марчанка і А. Мамкін у творах У. Ліпскага, інш.) [13 – 16; 19; 22; 23; 29 – 31].

5. Супастаўленне мастацкага плёну пісьменнікаў-ветэранаў або відавочцаў Вялікай Айчыннай вайны ў жанры аповесці, створанай у перыяд 1980 – 1990-х гг., з ранейшымі тэкстамі пра вайну тых жа самых аўтараў дае ўсе падставы зафіксаваць канкрэтныя праявы мастацкай эвалюцыі, характэрнай у пэўнай меры для кожнага з іх: ідэйнай – ад непасрэднай ацэнкі падзей 1940-х гг. да станаўлення светапогляду з экзістэнцыйным светаадчуваннем, з паглыбленым трагічным пафасам, а таксама са свядомым уключэннем у гуманістычныя духоўныя каштоўнасці пастулатаў хрысціянства; і фармальнай – ускладненне жанру аповесці праз узбагачэнне яе паэтыкі (шматфарбнасць рэалізму) і структуры (ад прозы аўтабіяграфічнай да з'яўлення дакументальна-мастацкай «прозы галасоў», дзе наратыў пабудаваны на пашпартызаваных сведчаннях

відавочцаў і ахвяр вайны). Выяўленая скіраванасць мастацкай думкі беларускіх майстроў жанру аповесці забяспечыла больш дакладную ацэнку тых духоўных і фізічных высілкаў і ахвяр, якія спраўдзіў беларускі народ (сумленны баец, партызан, падпольшчык, цывільны жыхар – дарослы або дзіця) у лёсавызначальнай барацьбе за перамогу над гітлераўскім фашызмам. Ацэнка страт беларусаў як нацыі ў ходзе вайны, асэнсаваная ў аўтабіяграфічных аповесцях яе ветэранаў і відавочцаў, аказалася надзвычай уражлівай. З улікам гэтых страт адмоўнае стаўленне беларуса да любой агрэсіі рэалізавалася не толькі ў праўдзівых сюжэтах айчынных пісьменнікаў, але і ў пафасе асуджэння вайны як непапраўнай трагедыі, прычым у маштабах не толькі пэўнай асобы, генерацыі, нацыі, але і ўсёй супольнасці, зразуметай у філасофскім плане. Прааналізаваныя аповесці пацвярджаюць, што адназначна адмоўнае стаўленне тыповага беларуса ў XXI ст. да ваенных канфліктаў зрабілася трывалай пазнакай нацыянальнага характару – найперш праз траўматычны вопыт 1940-х гг. У спасціжэнні названай спецыфікі беларускага менталітэту заключаецца сацыяльнае значэнне і эстэтычны патэнцыял айчыннай аповесці пра Вялікую Айчынную вайну як літаратурнага і культурнага феномена ў XX – пач. XXI стст. [2;

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Матэрыялы і вынікі дысертацыйнага даследавання паспяхова ўкараняюцца пры выкладанні курса «Беларуская літаратура» (вучэбная праграма ад 17.10.2018, рэгістрацыйны № УД – 37/18/вуч.) для студэнтаў 1 курса спецыяльнасці 1-21 05 06 «Рамана-германская філалогія», курса «Гісторыя беларускай літаратуры» (вучэбная праграма ад 27.06.2019, рэгістрацыйны № УД – 537/19/вуч.) для студэнтаў 2 курса спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)», таксама курса «Гісторыя культуры» (вучэбная праграма ад 19.05.2017, рэгістрацыйны № УД – 146/17/вуч.) для студэнтаў 1 курса спецыяльнасці 1-21 03 01 «Гісторыя (па напрамках)» гуманітарнага факультэта ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Асноўныя палажэнні дысертацыі будуць запатрабаваны пры стварэнні падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных факультэтаў; у педагагічнай практыцы пры складанні лекцыйных курсаў у вышэйшых навучальных установах, падрыхтоўцы спецкурсаў па беларускай літаратуры, праблемах літаратурных традыцый і наватарства.

Навуковая значнасць атрыманых вынікаў заключаецца ў даследаванні праблем раскрыцця ваеннай тэмы ў беларускай аповесці ў іх цэласнасці і варыятыўнасці, што забяспечвае стварэнне неабходнага падмурка для вывучэння праблемы ў беларускай літаратуры іншых перыядаў, у іншай жанравай спецыфіцы, а таксама пры параўнальным аналізе эстэтыкі еўрапейскіх літаратур, прысвечанай ваеннай тэматыцы.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

### Артыкулы ў рэцэнзуемых навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК

1. Баградава, Т. Р. Дарога да сябе або праблема жыцця і смерці ў творчасці В. Быкава / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2004. – № 3. – С. 58–60.

2. Баградава, Т. Р. Мастацкая трансфармацыя праблемы чалавечага быцця на матэрыяле беларускай «ваеннай» аповесці В. Быкава і І. Навуменкі / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2005. – № 7. – С. 189–192.

3. Баградава, Т. Р. Быццё і небыццё: мастацкае асэнсаванне праблемы на матэрыяле аповесцей В. Быкава і І. Навуменкі / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2006. – № 1. – С. 112–115.

4. Баградава, Т. Р. Прырода «гераічнага» ў «ваеннай» аповесці В. Быкава, І. Навуменкі, І. Шамякіна / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2008. – № 1. – С. 158–163.

5. Баградава, Т. Р. Вытокі жанру беларускай «ваеннай» аповесці ў творчасці М. Гарэцкага / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2009. – № 7. – С. 160–163.

6. Баградава, Т. Р. Філасофскія матывы быцця ў кантэксце беларускай «ваеннай» аповесці (М. Гарэцкі, Я. Колас, К. Чорны) / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2010. – № 7. – С. 121–128.

7. Баградава, Т. Р. Чалавек як выразнік асноўных ідэй і прынцыпаў «ваеннай» аповесці І. Пташнікава / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2011. – № 10. – С. 28–33.

8. Баградава, Т. Р. Паказ трагізму чалавечага быцця ў беларускай мастацка-дакументальнай аповесці пра вайну / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2013. – № 10. – С. 7–10.

9. Баградава, Т. Р. Мастацкае бачанне ваеннай рэчаіснасці ў аповесцях І. Навуменкі / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2014. – № 10. – С. 51–54.

10. Баградава, Т. Р. Асаблівасці станаўлення «ваеннай» аповесці В. Быкава / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2016. – № 10. – С. 84–88.

11. Баградава, Т. Р. Псіхалагізм і сродкі яго перадачы ў «ваеннай» аповесці Алеся Адамовіча «Хатынская аповесць» / Т. Р. Баградава // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А. Гуманитарные науки. – 2017. – № 2. – С. 7–11.

12. Баградава, Т. Р. Феномен дзяцінства і юнацтва ў кантэксце беларускай аповесці пра Вялікую Айчынную вайну / Т. Р. Баградава // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Філалогія. – 2018. – № 2. – С. 17–25.

13. Баградава, Т. Р. Мадыфікацыя ваеннай тэмы ў аповесцях В. Казько 1990-х гг. (на матэрыяле кнігі «Час збіраць косці») / Т. Р. Баградава // Роднае слова. – 2019. – № 7. – С. 23–25.

14. Багарадава, Т. Р. Формы мастацкай рэпрэзентацыі быцця ў аповесцях А. Адамовіча «Апошняя пастараль» (1986) і В. Быкава «Пакахай мяне, салдацік» (1996) / Т. Р. Багарадава // Весці БДПУ ім. М. Танка. Сер. 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2019. – № 2. – С. 154–158.

15. Багарадава, Т. Р. Постсавецкі кантэкст вачыма ветэрана Вялікай Айчыннай вайны (на матэрыяле аповесцей 1980–1990-х гг. В. Астаф'ева, Р. Бакланава, В. Казько) / Т. Р. Багарадава // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 1. Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. – 2020. – № 1. – С. 86–91.

16. Багарадава, Т. Р. Тэма ваеннага палону ў аповесцях К. Варабьёва «Гэта мы, Госпадзі!» (1943, 1986) і М. Аўрамчыка «Палон» (1991) / Т. Р. Багарадава // Весн. Магілёўс. дзярж. ун-та ім. А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2020. – № 1(55). – С. 129–134.

**Артыкулы ў навуковых выданнях**

17. Багарадава, Т. Р. Матыў «маленькага чалавека» ў прозе Васіля Быкава (на прыкладзе твораў «Балота» і «Бедныя людзі») / Т. Р. Багарадава // Да 80-годдзя народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава : зб. навук. арт / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: У. В. Рагойша (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 165–171.

18. Багарадава, Т. Р. Эвалюцыя быцця і псіхалагічнага стану героя. Мастацка-моўныя сродкі яе паказу ў аповесцях Я. Коласа 20–30-х гадоў / Т. Р. Багарадава // Белорусская литература и мировой литературный процесс : междунар. науч. сб. / Полоц. гос. ун-т ; редкол.: А. А. Гугнин (отв.) [и др.]. – Новополоцк : ПГУ, 2005. – Вып. 1. – С. 123–130.

19. Багарадава, Т. Р. Асэнсаванне праблемы «вайна і дзяцінства» ў аповесці В. Казько / Т. Р. Багарадава // Контексты мировой литературы : сб. науч. ст. к 70-летию проф. А. А. Гугнина / Полоц. гос. ун-т ; редкол.: Д. А. Кондаков (отв.) [и др.]. – Новополоцк : ПГУ, 2011. – С. 279–281.

20. Багарадава, Т. Р. Сродкі выражэння аксіялагічных арыентацый у «ваеннай» аповесці І. Шамякіна «Агонь і снег» / Т. Р. Багарадава // Аксиологический диапазон художественной литературы : сб. науч. ст. / Витеб. гос. ун-т им. П. М. Машерова ; рэдкал.: В. Ю. Боровко (отв.) [и др.]. – Витебск, 2017. – С. 36–39.

21. Багарадава, Т. Р. Ваенны дыскурс і ўплыў мастацка-культурнай практыкі М. Гарэцкага на айчынную аповесць / Т. Р. Багарадава // Нацыянальныя культуры ў міжкультурнай камунікацыі : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. Ю. Лебедзеў (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 278–286.

22. Багарадава, Т. Р. Адлюстраванне праблемы «чалавек-абставіны» ў ваенных аповесцях І. Новікава і І. Шамякіна 1990-х гг. / Т. Р. Багарадава // Нацыянальныя культуры ў міжкультурнай камунікацыі : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Т. С. Супранкова (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2019. – С. 481–489.

23. Богорадова, Т. Р. Дневниковые записи как фактографическая основа белорусской военной повести / Т. Р. Богорадова // Филологические и социокультурные вопросы науки и образования : сб. науч. ст. / Кубан. гос. технол. ун-т ; редкол.: Е. В. Ильинова (отв.) [и др.]. – Краснодар, 2019. – С. 79–89.

24. Багарадава, Т. Р. Традыцыйнае і наватарскае ўзнаўленне падзей у аповесцях А. Кулакоўскага і А. Савіцкага 1980-х гг. / Т. Р. Багарадава // Мова і міжкультурная камунікацыя: сучасныя вектары развіцця : зб. навук. арт. / Палес. дзярж. ун-т ; рэдкал.: К. К. Шэбека (старш.) [і інш.]. – Пінск, 2019. – С. 310–316.

**Матэрыялы канферэнцый**

25. Багарадава, Т. Р. Жанчына і вайна ў беларускай «ваеннай» аповесці (на матэрыяле творчасці В. Быкава і І. Шамякіна) / Т. Р. Багарадава // Гендер и проблемы коммуникативного поведения : материалы четвёртой Междунар. науч. конф., Полоцк, 28–29 окт. 2010 г. / Полоц. гос. ун-т ; редкол.: М. Д. Путрова (гл. ред.) [и др.]. – Новополоцк : ПГУ, 2010. – С. 215–217.

26. Багарадава, Т. Р. Інтэрпрэтацыя паняцця «чужы» ў «ваеннай» аповесці В. Быкава / Т. Р. Багарадава // Гендер и проблемы коммуникативного поведения : материалы шестой Междунар. науч. конф., Полоцк, 27–28 окт. 2016 г. / Полоц. гос. ун-т ; редкол.: М. Д. Путрова (гл. ред.) [и др.]. – Новополоцк : ПГУ, 2016. – С. 180–183.

27. Багарадава, Т. Р. 1917 год у кантэксце «ваеннай» аповесці М. Гарэцкага «На імперыялістычнай вайне» / Т. Р. Багарадава // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць : матэрыялы XXV Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 22 чэрв. 2017 г. / Дзярж. музей гісторыі белар. літ-ры, Рэсп. фонд ім. братоў Гарэцкіх, Цэнтр дослед. беларус. культуры, мовы і літаратуры Нац. акад. навук Беларусі ; рэдкал.: Р. Гарэцкі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – С. 38–43.

28. Багарадава, Т. Р. Айчынная аповесць у кантэксце ваеннага дыскурсу / Т. Р. Багарадава // Чалавек, Радзіма, свет у мастацкай прасторы Васіля Быкава : матэрыялы навуковай канферэнцыі аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў, Віцебск, 10 кастр. 2018 г. / Віцебс. дзярж. ун-т ім. П. М. Машэрава ; рэдкал.: В. Ф. Падстаўленка (гал. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2018. – С. 7–10.

29. Багарадава, Т. Р. Аповесць М. Гарэцкага ў кантэксце сусветнай літаратурнай ваеннай праблематыкі / Т. Р. Багарадава // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць: матэрыялы XXVI Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 19 крас. 2018 г. / Дзярж. музей гісторыі беларус. літ-ры, Рэсп. фонд ім. братоў Гарэцкіх, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літаратуры Нац. акад. навук Беларусі ; рэдкал.: Р. Гарэцкі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 50–55.

30. Багарадава, Т. Р. Роля экстрапаляцыі ў эвалюцыі ваеннай тэмы (на прыкладзе аповесцей К. Чорнага, С. Грахоўскага, У. Дамашэвіча) / Т. Р. Багарадава // Навукова-метадычная думка на Беларусі : матэрыялы рэгіян. (з міжнар. удзелам) навук.-практ. канф., прысв. 100-годдзю «Беларускай граматыкі для школ» Б. Тарашкевіча, Віцебск, 5 снеж. 2018 г. / Віцебс. дзярж. ун-т ім. П. М. Машэрава ; рэдкал.: Г. А. Арцямёнак (гал. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2018. – С. 15–20.

31. Багарадава, Т. Р. Спецыфіка мастацкага адлюстравання ваеннага кантэксту ў аповесцях Н. Гілевіча і Б. Сачанкі 1980 – 1990-х гг. / Т. Р. Багарадава // Мова і літаратура : матэрыялы 77-й навук. канф. студэнтаў і аспірантаў філалаг. факультэта БДУ, Мінск, 22 крас. 2020 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: К. А. Тананушка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2020. – С. 17–20.

# РЭЗЮМЭ

## Багарадава Таццяна Робертаўна

## Эвалюцыя ўвасаблення ваеннай тэмы пісьменнікамі-ветэранамі і сведкамі Вялікай Айчыннай вайны ў беларускай аповесці (1980 – 1990-я гг.)

**Ключавыя словы:** беларуская літаратура, аповесць, жанр, Вялікая Айчынная вайна, ветэраны, эвалюцыя, аўтарэфлексія, траўма, экзістэнцыйнае светаадчуванне, дакументалізм.

**Мэта даследавання:** вызначэнне сутнасці і спецыфікі эвалюцыі ў асэнсаванні ваеннай тэмы беларускімі пісьменнікамі-ветэранамі або відавочцамі Вялікай Айчыннай вайны на прыкладзе жанру аповесці, створанай у перыяд 1980 – 1990-х гг., у аспекце кантэкстуальнага аналізу.

**Метады даследавання.** У аснове працы – пастулаты культурна-гістарычнага, параўнальна-гістарычнага метадаў, прыёмы цэласнага аналізу мастацкага тэксту, што дало магчымасць вылучыць вядучыя тэндэнцыі і формы раскрыцця ваеннай тэмы ў спадчыне пісьменнікаў-ветэранаў, сведкаў і ахвяр ваенных падзей, а таксама вызначыць творчыя пазіцыі абраных для разгляду аўтараў з улікам змены гісторыка-культурнай парадыгмы.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** У дысертацыі ўпершыню сістэмна і паслядоўна вызначана сутнасць познесавецкага абнаўлення трактовак тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў жанры аповесці, створанай у 1980 – 1990-я гг. беларускімі пісьменнікамі з франтавым вопытам, удзельнікамі антыфашысцкага супраціву і ахвярамі дзіцячай ваеннай траўмы з дзвюх генерацый: а) народжаных у 1910-я гг.; б) народжаных у 1920 – 1940-я гг.; выяўлена канцэптуальная эвалюцыя ад арыенціраў савецкага сацыялістычнага рэалізму да экзістэнцыйнага і рэлігійнага светаадчування, да ўзбагачэння жанравага дыяпазону ваеннай аповесці праз паглыбленую аўтарэфлексію, наіўны касмізм, паэтыку антыўтопіі, дакументалізм, «прозу галасоў»; створана новая сістэматызацыя беларускай аповесці пра Вялікую Айчынную вайну як частку Другой сусветнай у творчасці М. Аўрамчыка, В. Быкава, А. Карпюка, А. Кулакоўскага, І. Навуменкі, І. Новікава, А. Савіцкага, І. Шамякіна, а таксама А. Адамовіча, А. Асіпенкі, Н. Гілевіча, У. Дамашэвіча, В. Казько, У. Ліпскага, Б. Сачанкі з улікам кантэксту папярэдняй беларускай прозы ХХ ст. пра вайну ў жанры аповесці.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў.** Матэрыялы і вынікі навуковай работы могуць быць выкарыстаны пры стварэнні падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных факультэтаў; у педагагічнай практыцы пры пабудове лекцыйных курсаў у вышэйшых навучальных установах, падрыхтоўцы спецкурсаў па беларускай літаратуры, праблемах літаратурных традыцый і наватарства.

**Галіна прымянення:** літаратуразнаўства (гісторыя літаратуры, тэорыя літаратуры); дысцыпліны гуманітарнага профілю (сацыялогія, філасофія, культуралогія).

# РЕЗЮМЕ

## Богорадова Татьяна Робертовна

## Эволюция воплощения военной темы писателями-ветеранами и свидетелями Великой Отечественной войны в белорусской повести (1980 – 1990-е гг.)

**Ключевые слова:** повесть, жанр, Великая Отечественная война, ветераны, эволюция, авторефлексия, травма, экзистенциальное мироощущение, документализм.

**Цель исследования:** определение сущности и специфики эволюции в осмыслении военной темы белорусскими писателями-ветеранами или очевидцами Великой Отечественной войны на примере жанра повести, созданной в период 1980 – 1990-х гг., в аспекте контекстуального анализа.

**Методы исследования.** В основе работы – постулаты культурно-исторического, сравнительно-исторического методов, приемы целостного анализа художественного текста, что дало возможность выделить ведущие тенденции и формы раскрытия военной темы в наследии писателей-ветеранов, свидетелей и жертв военных событий, а также определить творческие позиции избранных для рассмотрения авторов с учетом изменения историко-культурной парадигмы.

**Полученные результаты и их новизна.** В диссертации впервые системно и последовательно определена сущность позднесоветского обновления трактовок темы Великой Отечественной войны в жанре повести, созданной в 1980 – 1990-е гг. белорусскими писателями с фронтовым опытом, участниками антифашистского сопротивления и жертвами детской военной травмы из двух генераций: а) рожденных в 1910-е гг.; б) рожденных в 1920 – 1940-е гг.; выявлена концептуальная эволюция от ориентиров советского социалистического реализма до экзистенциального и религиозного мироощущения, до обогащения жанрового диапазона военной повести через углубленную авторефлексию, наивный космизм, поэтику антиутопии, документализм, «прозу голосов»; создана новая систематизация белорусской повести о Великой Отечественной войне как части Второй мировой в творчестве М. Аврамчика, В. Быкова, А. Карпюка, А. Кулаковского, И. Науменки, И. Новикова, А. Савицкого, И. Шемякина, а также А. Адамовича, Н. Гилевича, В. Домашевича, В. Козько, В. Липского, А. Осипенко, Б. Саченко с учетом контекста предыдущей белорусской прозы XX в. о войне в жанре повести.

**Рекомендации по использованию полученных результатов.** Материалы и результаты научной работы могут быть использованы при создании учебников и учебно-методических пособий для студентов филологических факультетов; в педагогической практике при посторении лекционных курсов в высших учебных заведениях, подготовке спецкурсов по белорусской литературе, проблемах литературных традиций и новаторства.

**Область применения:** литературоведение (история литературы, теория литературы); дисциплины гуманитарного профиля (социология, философия, культурология).

## SUMMARY

**Tatsiana Baharadava**

**Evolution of the war topic in the Belarusian novella (1980 – 1990's) by veteran writers and witnesses of the Great Patriotic war**

**Key words:** novella, genre, Great Patriotic war, veterans, evolution, auto-reflection, trauma, existential outlook, documentary details.

**The aim of the research** is defining the essence and the specifics of evolution in the understanding of the war topic on the material of the novellas written in the 1980 – 1990's by Belarusian veteran writers or witnesses of the Great Patriotic war. The research is done in the aspect of contextual analysis.

**The methods of the research.** The work is based on the cultural-historical and the comparative-historical methods, on the holistic approach to literary analysis; and all the methods give an opportunity to highlight the major trends in developing the war topic in the literary heritage of veteran writers, witnesses and victims of the military events, and to identify the values and the ideas of the reviewed authors considering the changes in the historical and cultural paradigm.

**The results obtained and their novelty.**

The author of the dissertation, for the first time, defines the essence of the late Soviet interpretations of the topic of the Great Patriotic war in the novellas of the 1980 – 1990's written by Belarusian writers with the front line experience, participants of the anti-fascist resistance, and children with military trauma from the following two generations: a) born in the 1910's; b) born in the 1920 – 1940's. The author reveals the conceptual evolution from the landmarks of Soviet socialist realism to the existential and religious outlook, to the enrichment of the genre range of the military novella through in-depth self-reflection, naive cosmism, poetics of anti-utopia, documentary details, "prose of voices". A new systematization of the Belarusian novella about the Great Patriotic War as part of the Second World war was created on the material of the works of M. Aŭramchyk, V. Bykau, A. Karpiuk, A. Kulakousky, I. Navumenka, I. Novikau, A. Savitsky, I. Shamiakin, as well as A. Adamovich, N. Hilevich, Ul. Damashevich, V. Kazko, V. Lipsky, A. Asipenka, B. Sachanka, the context of the preceding Belarusian prose of the XX century about war in the genre of the novella taken into account.

**Recommendations on application of the obtained results**. The materials of the research can be used when working on textbooks on human culture, literature, history, art; when teaching arts and humanities to students and when designing courses on Belarusian literature, on problems of literary tradition and innovation.

**Sphere of application:** literary criticism (history of literature, theory of literature); humanities disciplines (sociology, philosophy, cultural studies).

*Навуковае выданне*

БАГАРАДАВА Таццяна Робертаўна

**ЭВАЛЮЦЫЯ ЎВАСАБЛЕННЯ ВАЕННАЙ ТЭМЫ
ПІСЬМЕННІКАМІ-ВЕТЭРАНАМІ
І СВЕДКАМІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
Ў БЕЛАРУСКАЙ АПОВЕСЦІ (1980 – 1990-я гг.)**

Аўтарэферат дысертацыі
на суісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Падпісана да друку 09.02.2021. Фармат 60х84 1/16. Бумага афсетная.
Рызаграфія. Ум. друк. арк. 1,39. Ул.-выд. арк. 1,38. Тыраж 60 экз. Заказ 038.

Выдавец і паліграфічнае выкананне –
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных вырабаў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.